УДК 372.881.1

# ПРЫМЯНЕННЕ ПРЫЁМА “ПЫТАННЕ ВУЧНЯ ВУЧНЮ” НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ З МЭТАЙ ПАВЫШЭННЯ АРФАГРАФІЧНЫХ І ПУНКТУАЦЫЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ ВУЧНЯЎ

**Кухарэнка Іна Ільінічна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва”
(г. Магілёў, Беларусь)
mogilev_school39@octroo.datacenter.by

*Адной з актуальных праблем у выкладанні беларускай мовы, з якой сутыкаюся на ўроках, з’яўляецца нежаданне школьнікаў вучыць тэарытычны матэрыял – правілы. Задача настаўніка арганізаваць працу на ўроку, каб пытанні насілі праблемны, пошукавы характар.*

Адной з актуальных праблем у выкладанні беларускай мовы, з якой сутыкаюся на ўроках, з’яўляецца нежаданне школьнікаў вучыць тэарытычны матэрыял – правілы. Ніхто не будзе аспрэчваць, што веданне тэорыі – гэта неад’емная ўмова арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных кампетэнцый навучэнцаў [1, с. 36].

Адным з прыёмаў, якім карыстаюся многія гады, з’яўляецца прыём, які я называю “Пытанне вучня вучню”. Сутнасць яго заключаецца ў тым,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што пры падрыхтоўцы дамашняга задання – пісьмовага практыкавання, вучні павінны падрыхтаваць пытанне, якое яны зададуць на ўроку свайму аднакласніку [2, с. 19]. Напрыклад, пры вывучэнні ў 6 класе раздзела “Прыметнік” тэмы “Утварэнне прыналежных прыметнікаў”, пры праверцы дамашняга задання можна выклікаць трох вучняў па практыкаванню. Кожны вучань ад сваіх аднакласнікаў атрымлівае па тры пытанні. Па змесце параграфа можна задаць такія пытанні:

– як утвараюцца прыналежныя прыметнікі жаночага роду?

– з дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца прыналежныя прыметнікі мужчынскага роду?

– як пішуцца прыналежныя прыметнікі, утвораныя ад уласных імён?

Пры адказе на гэтыя пытанні вучны павінны прывесці прыклады. Задаюцца пытанні і па змесце папярэдніх параграфаў гэтага раздзела, і па змесце ўжо вывучанага раздзела. Калі ж той, каму адрасавана пытанне, не ведае адказу, то адказвае той, хто задаў пытанне, усё гэта адбываецца пры закрытых падручніках. Дзеці самі строга сочаць, каб усё было справядліва, прычым, для трох вучняў, якія адказвалі дамашняе заданне, усе пытанні павінны быць рознымі і не паўтарацца. Заўважана, што вучні 5-8 класаў, у якіх, як паказала практыка, мэтазгодна прымяняць гэты прыём, з цікавасцю адносяцца да такога віду працы. Ім падабаецца падрыхтоўваць складаныя пытанні і, калі той, каму яны адрасаваны, не ў стане адказаць, то па ўмове гэтага прыёму, яны адказваюць на пытанне самі.

Такі від працы дазваляе не толькі палепшыць тэарэтычную падрыхтоўку, але і развівае вуснае маўленне вучняў, лагічнае мысленне, памяць, бо яны вучацца фармуляваць пытанні, пры гэтым сочаць, каб пытанні не паўтараліся.

Калі заканчваецца раздзел і праходзіць урок па сістэматызацыі і абагульненні матэрыялу, то тыя пытанні тэорыі, што вынесены для абагульнення, у вучняў не выклікаюць цяжкасцей. Бо на працягу ўсяго перыяду вывучэння дадзенага матэрыялу амаль на кожным уроку праводзіўся тэарытычны трэнінг.

Роля настаўніка ў навучанні дзяцей такому віду працы вельмі адказная. Пачынаю, як правіла, адразу з 5 класа. Вучу дзяцей правільна фармуляваць пытанні па параграфах. Дзеля гэтага ў пачатку вывучэння тэмы ў 5 класе на прыкладзе правіла паказваю, якія пытанні можна сфармуляваць, падагульняю імі ўрок па пэўнай тэме. Вучу дзяцей сачыць за тым, як сфармулявана пытанне аднакласнікам, у чым яго недакладнасць, як можна сфармуляваць гэтае пытанне прасцей. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Абстрактныя назоўнікі”, вучні прапанавалі сфармуляваць такое пытанне:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“*Якія назоўнікі не ўспрымаюцца органамі пачуццяў (слых, зрок, нюх, дотык, смак)?*” Праэксперыментавалі з наступнымі назоўнікамі: стома, дабрата, цярпенне…

Вучні выяснілі, што гэтыя назоўнікі не ўспрымаюцца ні адныя з органаў пачуццяў. Так гэтае пытанне замацавалася ў практыцы.

Увогуле, правільна задаць пытанне – гэта цэлая навука. Я заўсёды гавару вучням, што яны павінны памятаць аб тым, што задаючы пытанне, неабходна ведаць на яго адказ.

Асаблівасць гэтага віду працы і ў тым, што ў ім удзельнічаюць вучні, якія жадаюць дапоўніць адказ. Задача настаўніка арганізаваць працу на ўроку, каб пытанні насілі праблемны, пошукавы характар. Бо дрэнна, калі гэта толькі інфармацыйны характар. Пры выстаўленні адзнак вучням за дамашнюю работу і за працу на ўроку ўлічваюцца і адказы на пытанні і зададзеныя пытанні. Гэта з’яўляецца паказчыкам паспяховасці вучняў і якасным паказчыкам урока.

**Спіс літаратуры**

1. Верціхоўская, М. І. Урокі літаратуры: пошук і творчасць : дапаможнік для настаўнікаў / М. І. Верціхоўская. – Мінск : Литература и искусство, 2008. – 224 с.

2. Лугоўскі, А. І. Методыка выкладання беларускай літаратуры. / А. І. Лугоўскі. – 3-е выд. – Мінск : БДПУ, 2007. – 74 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова